# Палітычная платформа

## Блоку беларускіх палітычных зьняволеных «Беларусы дзеяньня»

Беларусь перажывае адзін з самых цяжкіх і небясьпечных перыядаў сваёй сучаснай гісторыі. Краіна знаходзіцца пад аўтарытарным кантролем, грамадства разарвана рэпрэсіямі, а дзяржаўная суб’ектнасьць пастаўленая пад пагрозу праз залежнасьць ад Масквы і выкарыстаньне беларускай тэрыторыі ў вайне супраць Украіны. Унутры краіны сотні тысячаў людзей жывуць пад пастаянным ціскам — праз турмы, шантаж, эканамічныя пагрозы і страх за сваіх блізкіх.

Мы называем гэты стан рэчаў сістэмай закладніцтва. Яна трымаецца на гвалце і пастаянным выкарыстаньні людзей як інструмента кантролю — праз палітвязьняў, праз пагрозы сем’ям, праз ціск на бізнэс і прафэсійныя супольнасьці. Гэтая сістэма падтрымоўвае геапалітычную залежнасьць Беларусі ад усходняга суседа.

Наша палітычная мэта — разбурыць мэханізм закладніцтва і вярнуць Беларусі суб’ектнасьць у міжнароднай палітыцы. Бяз гэтага ніякая дэмакратыя, ніякія рэформы і ніякая будучая стабільнасьць немагчымыя.

Мы называем сябе «Беларусамі дзеяньня», таму што нас аб’ядноўвае гатоўнасьць браць адказнасьць і дамагацца выніку. За апошнія гады ў беларускім грамадстве зьявілася новая супольнасьць людзей, якія прайшлі праз турмы, падпольле, валянтэрскую працу, вайну ва Украіне, праз рэальныя рызыкі і страты. Гэты досьвед не дае маральнай вышэйшасьці, але ён дае разуменьне, што свабоду і дзяржаву трэба абараняць і будаваць, нават коштам асабістых ахвяраў.

Беларуская палітыка занадта доўга заставалася полем сімвалаў, заяваў і маральных жэстаў. Але ёй не хапала адказнасьці за вынік, бо адных толькі сімвалаў недастаткова. Калі прадстаўніцтва не ператвараецца ва ўплыў, яно паступова становіцца імітацыяй і губляе аўтарытэт.

Мы вырашылі ўдзельнічаць у працы Каардынацыйнай рады. Мы лічым, што КР мае сэнс толькі тады, калі яна становіцца сапраўдным прадстаўнічым органам, які здольны ўплываць на палітычныя прыярытэты і на кірунак агульнай стратэгіі.

Мы паважаем ролю Сьвятланы Ціханоўскай як міжнародна прызнанага прадстаўніка беларускай дэмакратыі і разумеем значэньне Офісу і Аб’яднанага пераходнага кабінету як цэнтраў міжнароднай працы і палітычнай каардынацыі. Але павага не адмяняе неабходнасьці інстытуцыйнага балянсу і падсправаздачнасьці. Для доўгатэрміновай легітымнасьці важна, каб прадстаўніцтва, выканаўчыя структуры і міжнародная дзейнасьць былі зьвязаныя праз празрыстую сістэму ўзаемнай адказнасьці і падсправаздачнасьці.

Каардынацыйная рада павінна быць месцам, дзе адбываецца сапраўдная палітычная дыскусія пра стратэгію, прыярытэты і адказнасьць. Яна мае сэнс тады, калі дадае агульнай працы дэмакратычных сілаў больш легітымнасьці, больш празрыстасьці і больш стратэгічнай яснасьці.

Але будучыня Беларусі вызначаецца ня толькі ўнутранай палітыкай, але і геапалітычным кантэкстам. Беларусь ужо зьяўляецца часткай рэгіянальнай сістэмы бясьпекі, незалежна ад таго, ці прызнае гэта цяперашні рэжым. Вайна Расеі супраць Украіны паказала, наколькі небясьпечнай можа быць страта суверэнітэту Беларусі.

Мы лічым, што падтрымка Украіны ў яе барацьбе за незалежнасьць адпавядае доўгатэрміновым інтарэсам Беларусі. Украінская перамога і ўмацаваньне рэгіянальнай бяспекі зьяўляюцца неабходнай умовай для таго, каб Беларусь змагла вярнуцца да дзяржаўнай самастойнасьці.

Адначасова мы лічым важным гаварыць з міжнароднымі партнэрамі мовай агульных інтарэсаў. Беларусь — гэта ня толькі краіна, якая патрабуе падтрымкі. Гэта таксама ключавы элемент бяспекі ўсходняга флангу Эўропы. Стабільная, незалежная і дэмакратычная Беларусь зьяўляецца важным фактарам бясьпекі для Украіны, Польшчы, Балтыйскіх краінаў і ўсяго рэгіёну.

Асобнае месца ў будучыні Беларусі займае бізнэс. У сучасных умовах многія прадпрымальнікі апынуліся пад ціскам, праз пагрозы крымінальнага перасьледу, праз шантаж і прымус. Бізнэс часта становіцца закладнікам той жа сістэмы, якая выкарыстоўвае страх і залежнасьць як інструмент улады. Мы лічым, што ў будучай Беларусі прадпрымальнікі павінны разглядацца як важная частка грамадства, здольная ўносіць уклад у аднаўленьне краіны і ўмацаваньне яе эканамічнай незалежнасьці.

Мы не абяцаем хуткіх перамог. Мы не абяцаем простых рашэньняў складаных праблем. І мы не абяцаем універсальнага адзінства, якое існуе толькі ў палітычных лозунгах.

Мы абяцаем іншае. Мы абяцаем гаварыць грамадзтву праўду пра маштаб выклікаў, перад якімі стаіць Беларусь. Мы абяцаем, што ня будзем гандляваць годнасьцю і выкарыстоўваць трагедыю людзей як палітычны рэсурс. І мы абяцаем рабіць усё магчымае, каб вярнуць беларускай палітыцы адказнасьць за словы, за рашэньні і за вынік.

«Беларусы дзеяньня» — гэта група людзей, якія хочуць вярнуць палітыцы сэнс, Каардынацыйнай радзе — уплыў, а прадстаўніцтву — адказнасьць.